


# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я.КУПАЛЫ

*№ 1 (229) 1 студзеня 1996 года, панядзелак*


# З Новым Годам!

## Шчасця ўсім!

Я шчэ адзін год адыходзіць у гісторыю. Якім ён быў для кожнага з нас? Які след пакінуў? Мяркую, што для ўсіх - складаны, аднолькава напружаны, неспакойны, а калі ўспомніць, дык напэўна не абышлося і без радасных падзей, без светлых і шчаслівых дзён.

Сёння, падсумоўваючы набыткі адыходзячага года, усім нам, хто працуе ці вучыцца ва універсітэце, не павінна быць сорамна, бо зроблена, безумоўна, шмат, ёсць добрыя зрухі, добрыя змены, ёсць перспектыва на дзень заўтрашні.

Існуе такі выраз: "зрабіць усё магчымае і немагчымае". Дык вось на мой погляд, мы з вамі ў нашым Гродзенскім універсітэце робім усё магчымае і немагчымае, каб рухаліся наперад навучанне і навука, каб забяспечыць калектыву пэўныя сацыяльныя даброты. І гэта пры тым, што фінансава-эканамічнае становішча універсітэта, як і іншых вну рэспублікі, застаецца надзвычай цяжкім.

Сёння ўсе мы можам быць упэўнены, што паспяхова дасягаецца наша галоўная мэта - стварэнне універсітэта класічнага тыпу, і ў мінулым годзе зроблены прыкметны крок у гэтым напрамку. Значна пашыраны спектр спецыяльнасцей, па якіх вядзецца навучанне, актывізуецца навукова-даследчая праца ў рамках міжнародных і рэспубліканскіх праграм, вызначаны прыярытэтныя яе напрамкі. Свайго роду эксперыментам можна назваць стварэнне фізіка-тэхнічнага калежа, а вось ужо і шматпрофільны ліцэй на базе СШ N 27. Па ініцыятыве універсітэта пры аблвыканкаме створаны каардынацыйна-апякунскі савет, які паспрыяў ужо і нашым справам: зроблены канкрэтны крок па паляпшэнню інфармацыйна-тэхнічнага забеспячэння вну, у прыватнасці, створана рэгіянальная сетка электронных сістэм камунікацыі і не далей як на пачатку года "ІНТЭРНЕТ" стане явай нашага паўсядзённага жыцця. Створаны міжнародны кансорцыум у складзе ГрДУ, школы бізнесу універсітэта Турына (Італія), універсітэта Варвіка (Англія) па праграме ТЭМПУС. Праект фінансуецца Еўрапейскім супольніцтвам.

На базе ГрДУ створаны камп'ютарны цэнтр UniSoft, які дапаможа пашырэнню і паглыбленню камп'ютарнай адукацыі насельніцтва, удасканаленню вучэбнага працэсу.

І гэты пералік можна працягваць. Бо рэдка які дзень не прыносіць нечага новага.

Вось і пры самым завяршэнні года прыемная навіна: былыя будынкі паграната рада перадаюцца ў карыстанне універсітэту. Дарэчы, тут мяркуем размясціць і інавацыйна-тэхнічны цэнтр.

Усё тое станоўчае, што дасягнута, што стала прадметам нашага гонару - плён працы канкрэтных людзей. Мне прыемна яшчэ раз сёння зазначыць: у нас склаўся сталы калектыў, якому падуладна любая справа. Высокі прафесіяналізм кадраў навукоўцаў дазваляе нават у гэтых цяжкіх умовах працаваць плённа, бачыць перспектыву. Мы аб'яднаны агульнымі мэтамі, мы ўсведамляем праблемы, якія ставіць жыццё і імкнёмся ісці насуперак цяжкасцям, бо інакш нельга. У нашых жа руках - будучыня нашай рэспублікі, нашай нацыі. Хто ведае, можа сярод сённяшніх нашых студэнтаў не проста здольныя хлопцы і дзяўчаты. Можа, праз колькі год яны, атрымаўшыя ў нас універсітэцкую падрыхтоўку, стануць сапраўднымі рэфарматарамі новага часу, паспрыяюць нейкім канкрэтным зменам да лепшага. Пад Новы год трэба верыць у гэта.

А Новы год, мяркую, будзе для ўсіх нас больш удалы і спрыяльны, чым папярэднія. Бо ніякімі цяжкасцямі сёння нас ужо не запалохаць, вопыт папярэдніх год загартаваў, ды і падмурак пад нагамі цвёрды, напрацоўкі трывалыя. Урад рэспублікі абяцае вышэйшай школе матэрыяльнае падспор'е, а гэта закране інтарэсы кожнага з нас. Стымулам для калектыву павінна стаць і нядаўна распрацаванае Палажэнне аб прэміраванні і надбаўках.

У Новым годзе яно будзе дзейнічаць. Будзем шукаць і іншыя шляхі маральнага і матэрыяльнага стымулявання, а таксама і крыніцы для дадатковага фінансавання, без якога нельга ўявіць сабе нармальнае функцыянаванне нашага вялікага універсітэцкага арганізму.

Пад Новы год прынята шчодра раздаваць падарункі і пажаданні. На жаль, падарункі атрымаюць толькі дзеці дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту, на якія выдаткавана 22 мільёна рублёў. Астатніх дазвольце павіншаваць словамі.

Няхай наша студэнцкая моладзь будзе багатая пяцёркамі ў залікоўцы, марамі - у душы, няхай хапае аптымізму глядзець у будучыню, а грошай - дацягнуць да чарговай стыпендыі. Жадаю працоўнаму калектыву універсітэта далейшай пленнай працы і творчага імпэту, няхай у кожнай сям'і ў Новым годзе трывала пасяліцца радасць, шчырасць, узаемаразуменне і матэрыяльны дабрабыт. Шчасця ўсім!

*Л. Ківач,*
*рэктар універсітэта.*



# НА ПАСЯДЖЭННІ ВУЧОНАГА САВЕТА

Адбылося чарговае сяджэнне Вучонага вета універсітэта. На ім лі разгледжаны ступныя пытанні: аб цвярджэнні тэм ы с е р т а ц ы й ашукальнікаў; аб цвярджэнні Палажэння надбаўках за высокія казчыкі ў працы і кананне тэрміновых і бліва складаных работ; зацвярджэнні Статута версітэта.

Вучоны Савет цвердзіў прапанаваныя зуковыя тэмы ы с е р т а ц ы й шукальнікаў.

На разгляд Савета былі дстаўлены два праекты меркавання надбавак: ей створанай камісіі і афкама. За аснову ыняты праект камісіі, у м прадугледжвае цца, о надбаўкі будуць дзяляцца за стабільныя высокія дасягненні ў працы, за выкананне асабліва важных і тэрміновых прац агульнауніверсітэцкага значэння. Факультэты і с т р у к т у р н ы я падраздзяленні павінны распрацаваць Палажэнне аб надбаўках. Відавочна, што не ўсе супрацоўнікі працуюць аднолькава. Гэта значыць, што і надбаўкі будуць, напэўна, атрымліваць самыя адказныя і працавітыя людзі.

Камісія па распрацоўцы Статута універсітэта ў складзе С.А. Маскевіча, В.В. Сянько, М.У. Сільчанкі і І.І. Вяленты зыходзіла з вызначэння неабходнасці Статута: Статут універсітэта павінен быць лаканічным, паслядоўным і лагічным, неабходна пазбягаць паўтору ў артыкулах і раздзелах, асвятляць стратэгічныя бакі ж ы ц ц я д з е й н а с ц і універсітэта. Прапановы і заўвагі ў Статут унеслі: філалагічны факультэт, псіхалогіі і педагогікі, матэматычны, біялогіі і экалогіі, аддзел маркетынгу, факультэт замежных моваў, студэнцкі прафкам, група вядучых прафесараў (6 чалавек). Камісія апрацавала і прыняла да ўвагі ўсе слушныя дапаўненні.

Пад час абмеркавання прафесар М.У. Сільчанка выказаў меркаванне, што ёсць парушэнні ў фармаванні Савета універсітэта. Таму было вырашана стварыць камісію для высвятлення гэтага пытання, а галасаванне па прыняццю новага Статута не адбылося.

*Н. Пятрова.*

# ГОСЦІ З АМЕРЫКІ

Інфармацыйны цэнтр сольства ЗША у спубліцы Беларусь аводзіў семінар ывучэнне Амерыкі", які быўся ў Гродзенскім ржаўным універсітэце Я. Купалы. Семінар быў ганізаваны для кладчыкаў вну г. Гродна ля настаўнікаў школаў. начасова праходзіў мінар і для студэнтаў: па ратуры Англіі і ЗША, орыі ЗША, па развіццю намічных раёнаў ерыкі.

П а в е д а м л е н н і кладчыкаў змяшчалі ыя даведкі па развіццю номікі, культуры і кацыі ЗША. Слухачы наёміліся з новай для трактоўкай вядомых раў амерыканскай літаратуры, з арыгінальнымі методыкамі вывучэння замежных моваў, выкарыстання новай сучаснай тэхналогіі навучання.

*Н.Дудко.*



*На здымку: спадарыня Дж. Дэмірэй, прафесар Левандоўскі (ЗША), рэктар Еўрапейскага універсітэта (г. Мінск) у адной з аўдыторый нашага універсітэта.*

*Фота А.Пятрова.*

## ВІНШУЕМ

*прарэктара па навуковай працы МАСКЕВІЧА Сяргея Аляксандравіча з паспяховай абаронай доктарскай дысертацыі.*

## Наваселлі не за гарамі...

Упраўленне капітальнага будаўніцтва аблвыканкама ўзводзіць жылы дом па вуліцы Горкага. У ліку шчаслівых навасёлаў будуць і 22 сям'і работнікаў нашага універсітэта. Сцвярджаць, што кватэры будуць здадзены, як і плануецца, у тэрмін, у сакавіку - вельмі рызыкоўна, бо праблема сродкаў можа пераблытаць усе планы. "Каробка" дома ўжо збудавана. Вядуцца ўнутраныя работы. Але іх, як кажуць, непачаты край...

* * *

Жыццё не стаіць на месцы нават у гэты нялёгкі час. Радасна і сумна адзначаць, што нашаму універсітэту з кожным годам усё больш цесна ў звыклых сценах. І вось у канцы года прыемная навіна: універсітэту перадаецца комплекс будынкаў па вуліцы Горкага, дзе шмат гадоў размяшчаўся пагранічны атрад. З цягам часу на абодвух берагах Гараднічанкі размесціцца ўся вучэбна-лабараторная база фізіка-тэхнічнага факультэта. Мяркуецца, што першыя "наваселлі" некаторыя кафедры адзначаць ужо ў канцы новага года. Прадстаіць выканаць вялікі аб'ём рамонтных работ, пабудаваць новыя памяшканні.І хаця справа гэта ні аднаго года, усё ж ёсць падстава радавацца добрым зменам.

## АСВОІЛІ ДРУКАВАННЕ

Снежаньскі нумар нашай газеты крышку прыпазніўся да сваіх чытачоў, затое быў аддрукаваны не ў абласной друкарні, а ва універсітэце. Цэлы тыдзень шчыравалі над асваеннем новай для сябе тэхналогіі спецыялісты паліграфічнага ўчастка выдавецкага аддзела. І ўсё ж такі запрацавала новае чэшскае абсталяванне. Гэты нумар, мяркуем, атрымаецца хутчэй і больш удала, бо сярод выкладчыкаў ГрДУ знайшліся спецыялісты, якія ведаюць чэшскую мову. Яны зрабілі пераклад тэхнічнай дакументацыі, што дазволіць больш дакладна і поўна асвоіць абсталяванне. Дзякуй усім за старанне!

*С.Мурына.*

# Студэнтка... на пенсіі

Пра яе жыццё можна было б напісаць вялікую захапляючую кнігу. Лёс наканаваў ёй шмат гора і пакут, не абышоў шчаслівымі імгненнямі творчых узлётаў і каштоўных знаходак. Яна даўно ўжо на пенсіі, але без справы не ўяўляе сваіх дзён. Выкладае на кафедры, удзельнічае ў канферэнцыях, шмат піша і друкуецца.І вось нядаўна я даведалася, што Б.Б. Віц-Маргулес, так горача ўлюбёная ў сваю антычнасць, нягледзячы на пенсійны ўзрост, усё яшчэ вучыцца. Аб гэтым я і запытала Браніславу Барысаўну. Адказ быў станоўчы:

*- Сапраўды, - пацвердзіла яна, - я студэнтка-завочніца Адкрытага Ізраільскага універсітэта, вучуся ў адным з яго філіялаў, у Мінску, засвойваю выбраную мною праграму "Некоторые главы из истории евреев Восточной Европы". Курс ахоплівае гісторыю яўрэяў Польшчы, Вялікага княства Літоўскага (у тым ліку і нашай Гродзеншчыны), Украіны, Літвы.*

- І якія поспехі ў навучанні?

*- Выканала ўсе 6 кантрольных работ з адзнакай па 100 балаў - вышэйшай адзнакай у яўрэйскай сістэме навучання. У студзені маюць адбыцца экзамены. Паспяхова іх здаўшы, атрымаю адпаведны сертыфікат.*

Гэта, несумненна, будзе прыкметная з'ява ў жыцці Браніславы Барысаўны ў новым годзе. А чым памятны быў для яе год адыходзячы? Мая суразмоўца не хавае радасці:

*-Стаў студэнтам-першакурснікам нашага універсітэта мой унук, яго захапленне - матэматыка. Больш, чым калі-небудзь, у мяне надрукавана навуковых прац. Атрымала заказ з Польшчы падрыхтаваць нататкі-успаміны пра даваенны перыяд Львоўскага універсітэта. Заданне гэта выконвала ледзь не да самага навагодняга свята, матэрыял напісала і аддрукавала на польскай мове.*

Выканала заказ з Мінска, зрабіла пераклад з лацінскай мовы дзесятай кнігі "Скарочанай Рымскай гісторыі" Эўтропія, рымскага гісторыка IV стагоддзя і падрыхтавала навуковыя заўвагі да яе. Вось-вось будзе аддрукавана мая манаграфія.

Гляджу на яе рухавую постаць, слухаю пра яе захапленне антычнасцю, адзначаю яе нястомнасць і неабыякавасць да спраў, яе аптымістычны настрой і нескаронасць перад жыццёвымі хібамі і думаю: як добра, што ёсць сярод нас такія неабыякавыя, фанатычна адданыя навуцы людзі, як Браніслава Барысаўна. Не, гэта не кволы парастак зямлі, гэта самабытная жыццяздольная і жыццялюбівая кветка ў вянку прагных да працы людзей, на якіх трымаецца і навука, і грамадства. Няхай яшчэ доўгім і плённым будзе Ваш творчы прасцяг, паважаная Браніслава Барысаўна. Здароўя Вам, светлых думак, добрых набыткаў і ў Новым годзе.

*С.Бераст.*

# Чалавек года: што турбуе, што радуе?



Як паведамляла ўжо наша газета, Амерыканскі біяграфічны інстытут назваў І.П. Мартынава, прарэктара па навучальнай працы нашага універсітэта, чалавекам года.

Напярэдадні Новага года я пацікавілася ў Івана Платонавіча, чым адметны быў для яго мінулы год наогул, што турбавала, што радавала.

Не без гонару мой суразмоўца канстатаваў: у верасні мінула 30-годдзе працы ва універсітэце. Прыйшоў сюды выпускнік фізмата Гродзенскага педінстытута ў 1965 годзе, маючы ўжо невялікую практыку выкладання матэматыкі ў сярэдняй школе. Пачынаў у нас асістэнтам кафедры, і за тры дзесяцігоддзі паслядоўна пераадолеў усе прыступкі прафесійнай лесвіцы. Мінулым летам дэкана матэматычнага факультэта, прафесара, доктара навук Мартынава віншавалі з новай пасадай. Ён стаў прарэктарам універсітэта. Іван Платонавіч ніколі не парываў сувязяў са школай, адкрываючы і выхоўваючы там новыя імёны перспектыўных матэматыкаў, якія ўжо закончылі універсітэт або вучацца. Сярод яго былых школьных вучняў ёсць дактары і кандыдаты навук, былыя студэнты-матэматыкі самі сталі выкладчыкамі.

У мінулым годзе дзесяткамі грунтоўных публікацый у навуковых часопісах папоўніўся творчы багаж Мартынава-навукоўца і матэматыка. Плённым быў яго ўдзел у рабоце шматлікіх канферэнцый. Добры след пакінула, напрыклад, Міжнародная канферэнцыя матэматыкаў "Яругінскія чытанні". Цікавай была праца над часопісам "Альфа", у якім ён - намеснік рэдактара.

Зусім нядаўна І.П. Мартынаў разам са студэнтам-другакурснікам Станіславам Сабалеўскім пабывалі на семінары па праблемах матэматычнай адукацыі ў рэспубліцы, арганізаваным у рамках Міжнароднай Сорасаўскай праграмы адукацыі ў галіне дакладных навук.

Абраны Іван Платонавіч членам спецыялізаванага савета Белдзяржуніверсітэта па абароне доктарскіх дысертацый.

Атрымаў запрашэнне з Каліфорніі, з Амерыканскага біяграфічнага інстытута на ўдзел у канферэнцыі, якая вясной 1996-га года збярэ разам людзей года. Атрымаў паведамленне з інтэрнацыянальнага біяграфічнага цэнтра ў Кембрыджы, які таксама прызнаў яго чалавекам 1995-96 навучальнага года.

І, нарэшце, адна з самых дарагіх і памятных падзей адыходзячага года - унучка Надзейка пайшла ў першы клас. Хто ведае, можа, некалі і яна парадуе дзядулю сваім захапленнем і поспехамі ў матэматыцы. Няхай так яно і будзе! Няхай будзе ў Івана Платонавіча шмат таленавітых і перспектыўных вучняў, паслядоўнікаў яго справы. Няхай яшчэ больш плённым, творчым і шчаслівым будзе новы год жыцця!

*С. Мурына.*

***Як жывеш, выпускнік?***

# Учора - студэнт, сёння - выкладчык

Пастаянныя чытачы нашай газеты, напэўна добра ведаюць Аляксандра Грыня, выпускніка універсітэта 1995 года. Мы неаднойчы пісалі аб ім як аб ленінскім стыпендыяце, актыўным удзельніку агульнауніверсітэцкіх мерапрыемстваў. Прыемна было даznацца, што зараз А.Грынь - выкладчык-стажор на матэматычным факультэце. З упэўненасцю А.Грынь гаворыць аб тым, што абраў правільны шлях і менавіта матэматыцы ён хацеў бы прысвяціць сваё жыццё.

*- Аляксандр, 1995 год адыходзіць у гісторыю. Чым для Вас ён быў асабліва памятным?*

- Шмат чаго адбылося: прыемнага і непрыемнага. Памятаецца ўсё добрае: 5 гадоў вучобы падышлі да завяршэння, і вось вынік - доўгачаканы дыплом. Гэта галоўнае. А потым ... А потым было хваляванне перад тым, як упершыню ўваходзіў у аўдыторыю да студэнтаў у якасці выкладчыка. Хваляванні перамяжоўваліся з настальгіяй: ці даўно я сам сваволіў у гэтым пакоі? Прыкладу ўсе намаганні, каб заваяваць павагу студэнтаў і заахвоціць іх цудоўнай навукай.



*- Вашы пажаданні напярэдадні Новага года?*

- У кожнага чалавека - свае імкненні і надзеі. Я жадаю ўсім, па-першае, здароўя і здзяйснення хаця аднай, самай запаветнай мары. Хацелася б, каб у нашай маленькай краіне ўсталяваліся парадак і стабільнасць. Для мяне асабіста добры Дзед Мароз няхай прынясе кавалачак шанцавання.

*Н.Дудко.*

*Фота А.Пятрова.*



**Навуковая канферэнцыя ў Беластоку**

# Нашу мову ведаюць

Краіны, народы, людзі спрадвеку былі раз'яднаны шматлікімі межамі: моўнымі, прасторавымі. Але тое лепшае, што ёсць у чалавека, заўсёды нараджала імкненне да збліжэння, паразумення. Асабліва гэта характэрна людзям навукі, бо навука, па вялікім рахунку, з'ява ўсё ж нацыянальная. Так, у кожнага народа - свая гісторыя, свая літаратура. І кожны гісторык, літаратуразнаўца - прадстаўнік сваёй нацыі, сваёй зямлі. А "між суседзяў-народаў не заўсёды ўсё гладка"/Д. Бічэль-Загнетава/. І ўсё ж імкнуцца дайсці да ісціны - ці ж не шлях навукоўца? Усё гэта і стала лейтматывам навуковай канферэнцыі "Pogranicze kultur narodowych", што адбылася ў Беластоку.

З усіх выступаў на пленарным пасяджэнні ( а гэта былі надзвычай цікавыя даклады прафесара з Ольштына Базыля Белаказовіча пра творчасць беларуска-руска-украінска-польскага навукоўца, пісьменніка, паэта Міколы Янчука, вядомага лінгвіста з Кіева Паўла Грыцэнкі па праблеме украінска-польскіх пагранічных сувязяў у святле ізафон, прафесара з Мінску Генадзя Цыхуна, які акрэсліў праблему яцвягаў у моўных беларуска-польскіх кантактах і інш.) найбольшае ўражанне зрабіў даклад нямецкага вучонага-лінгвіста Карла Гутшмідта "Нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы і граматыка А. Луцкевіча 1916 г." Гэта навуковая праца, па словах Г. Цыхуна, сапраўднае адкрыццё, звязанае з гісторыяй стварэння літаратурнай беларускай мовы. Ды ўразіла нават не гэта. З вуснаў нямецкага вучонага хораша гучала беларуская мова, крыху змякчаная, безумоўна, нямецкі акцэнт угадваўся, але - нашу мову ведаюць, ёю цікавяцца, яе вывучаюць.

Працавалі тры секцыі: мовазнаўчая, культуразнаўчая, гісторыка-літаратурная. Самымі цікавымі дакладамі на гісторыка-літаратурнай секцыі былі, на мой погляд, працы расійскіх літаратуразнаўцаў. Так, Лола Званарова з Масквы падрыхтавала надзвычай цікавае паведамленне пра арыфмалагічную сімволіку ў польскамоўных вершах Сімеона Полацкага і паэзіі Зінаіды Гіліус. Даследчыца здолела разгадаць глыбінную таямнічую сутнасць лічбаў, што арганічна ўплецены ў паэтычны кантэкст. Малады літаратуразнаўца, паэт Аляксандр Ананічаў прачытаў даклад "Смутное время в произведениях Николая Костомарова и Казимира Валишевского". Ягоныя развагі пра паўтаральнасць "смутных времен" у Расіі, пра ў нечым злавеснае імя Барыс для рускай гісторыі, гучалі надзвычай актуальна, сучасна.

Арыгінальнасцю вызначалася праца Мікалая Івенічава з Краснадарскага краю, літаратуразнаўцы, пісьменніка, чыё апавяданне прызнана лепшым апавяданнем году. Гэта быў зусім не навуковы даклад, гэта было глыбока лірычнае эсэ, маналог чалавека, захопленага паэзіяй, творцы, які адкрываў чацвёрты закон прыцягнення, самага значнага - закон кахання, па канонах якога заўсёды жылі людзі-творцы, паэты, якому заўсёды падпарадкоўвалася сапраўдная паэзія.

Даклады беларускіх навукоўцаў Уладзіміра Конана пра беларускі фальклор у творчасці Яна Чачота, Ксенафонта Лецкі пра жанрава-стылёвыя асаблівасці лірыкі польскамоўных паэтаў Беларусі XIX стагоддзя, Мікалая Труса, які разглядзеў развіццё беларускай паэзіі пачатку стагоддзя ў кантэксце славянскіх літаратур, былі праслуханы з надзвычайнай зацікаўленасцю. Мне асабіста было вельмі прыемна, што творчасць нашай гарадзенскай паэткі Дануты Бічэль-Загнетавай шырока вядома ў Польшчы.

Працы польскіх навукоўцаў Ванды Супы (Беласток), Надзеі Панасюк (Варшава), Ежы Мікрута (Люблін) і іншых вызначаліся надзвычайнай шырынёй даследаванага матэрыялу.

Непрыемна здзівілі выказванні некаторых мінскіх лінгвістаў накшталт: "Пасля рэферэндуму на Беларусі зніклі моўныя праблемы" ці "Тое раздваенне асобы, што панавала ў нас у выніку засілля беларускай мовы, зараз знікла". І гэта нашы беларускія мовазнаўцы. Няхай нават яны і займаюцца даследаваннем рускай мовы. Такая вось лыжка дзёгцю.

Канферэнцыі ў Беластоку - гэта традыцыя. Гэта штогадовыя надзвычай цікавыя навуковыя імпрэзы, якія збіраюць навукоўцаў з розных краінаў. І каму, як не нам, самым блізкім суседзям, гродзенскім навукоўцам удзельнічаць у іх правядзенні? А між тым, толькі трое выкладчыкаў нашага універсітэту змаглі ўзяць у іх удзел. І прычына зусім не ў нашай абыякавасці да таго, што адбываецца ў навуковым свеце, а ў тым, што універсітэт не мае магчымасці падтрымаць сваіх выкладчыкаў, забяспечыўшы ім кароткатэрміновае пражыванне за мяжой. Маем надзею, што гэтыя цяжкасці часовыя.

*А.Петрушкевіч,*
*удзельніца канферэнцыі.*

# Знаёмцеся:
## "ансамбль прыгоннага права"

Ад цікавага мінулага, на жаль, засталося ў нас зусім нямнога: песні, прымаўкі, прыказкі,прыпеўкі. Час такі, што мы больш заклапочаны: што з'есці, ці хопіць грошай да чарговага аванса, дзе што танней. Ці да спеваў нам?

І ўсё ж народная творчасць жыве, нягледзячы ні на якія цяжкасці. Жыве таму, што ў фальклоры адлюстроўваецца глыбокая душа народа, яго талент. Жывуць сярод нас людзі, для якіх адраджэнне народных таямніц - не проста захапленне, а сэнс жыцця, і заахвочваюць гэтай справай многіх і многіх, аб'ядноўваючы вакол сябе маладых юнакоў і дзяўчат.

Так, жыве ўжо шмат гадоў у нашым універсітэце фальклорны беларускі гурт, чацвёрты сезон ён існуе на філфаку. Пастаяннай назвы пакуль не мае, але члены калектыва называюць сябе жартоўна "ансамбль прыгоннага права". Чаму прыгоннага? Справа ў тым, што на першым курсе філфака студэнты вывучаюць творчы практыкум, танцуюць, спяваюць, хто на што здольны. А кіраўнікі ансамбля прыглядаюцца да іх і самых таленавітых запрашаюць на падрыхтоўчы курс у свой ансамбль, некаторыя рабяты пасля першага курса адыходзяць да іншых спраў па душы, а застаюцца сапраўдныя аматары народнай творчасці. І не толькі філолагі, у танцавальным і спеўным гуртах займаюцца і рабяты з іншых факультэтаў.

Мастацкі кіраўнік А.Ч. Лойка і харэограф А.У. Саланевіч з задавальненнем гавораць аб сваёй працы: падрыхтавалі да пастаноўкі новы абрад - "Купалле". Вельмі хацелася б паўдзельнічаць у студэнцкім фестывалі ў Віцебску, дзе кожны год адбываецца свята "Студэнцкая вясна", а паказаць гледачам ёсць што.

Я зазірнула на рэпетыцыю. Вітае цудоўны настрой, гумар, усмешкі, гучаць беларускія песні і музыка. У калектыве ўжо склаўся касцяк: Валянціна Гурневіч, Ірына Селязнёва, Надзея Раманчык, Наталля Гур'ян, Аляксандр Букейка, Віталь Клунейка, Валеры Валынец. Гэтыя здольныя маладыя людзі - душа калектыва, першыя памочнікі харэографа. Яны па-сапраўднаму любяць мастацтва і народную творчасць, менавіта з іх бяруць прыклад астатнія. Тэму для пастаноўкі выбірае, як правіла, кіраўнік, але члены калектыва не стаяць у баку, а дапамагаюць цікавымі парадамі. З ахвотай расказвалі аб першым выхадзе на сцэну: не было страху перад вялікай аўдыторыяй, бо многія прымалі ўдзел раней у школьнай самадзейнасці, а думалі аб тым, ці атрымаецца артыстычная ігра, ці спадабаецца яна гледачам. І ўсё атрымалася, і спадабалася. І ў першым, і ў другім гарадскіх фестывалях народных фальклорных абрадаў занялі І-е месца, сталі дыпламантамі і лаўрэатамі.

Склаліся свае маленькія традыцыі калектыва. Пасля заканчэння першага курса - пасвячэнне ў артысты. Пасля выступлення - прагляд відэазапісаў з самакрытыкай.

Рэпетыцыі спрыяюць і сяброўскім адносінам. Расказалі мне: танцавалі разам хлопец і дзяўчына, пакахалі адзін аднаго і ўтварылася сям'я. Ёсць сярод артыстаў-фалькларыстаў "дзяды", так іх любоўна называюць у ансамблі: Святлана Шах і Алег Малючык закончылі універсітэт, працуюць у школах горада, а развітвацца з гуртом не збіраюцца.

Асаблівую падзяку кіраўнікі і ўдзельнікі ансамбля выказваюць Р.Л. Левінай і П.Л. Навіцкаму - людзям, якія падтрымліваюць студэнцкі калектыў, заўсёды разумеюць яго праблемы.

Праблем у калектыва, як і ва ўсіх, шмат. Няма фундатараў, няма грошай. Патрэбны інструменты, няма гармоніка. Пад час выступлення артысты мяняюць у касцюмах асобныя дэталі, бо маюць толькі адзін сцэнічны беларускі касцюм.

Надыходзіць Новы год. Заўсёды мы спадзяёмся, што ён прынясе нам нешта новае, цікавае, што ўсе праблемы застануцца ў мінулым годзе. Думаю, што кіраўнікі і члены фальклорнага гурта таксама мараць аб гэтым. Дык няхай здзейсняцца ўсе іх мары і планы, і добрым падарункам будуць апладысменты.

*Н.Пятрова.*



# 101 год тому...

## Из истории необычных природных явлений

В современном языке термин "история" употребляется неоднозначно. Этим словом, кроме обозначения процесса развития человеческого общества и науки, которая изучает этот процесс, можно назвать любой процесс развития, происходящий в окружающем нас мире, а также любое происшествие, явление или рассказ о нем. В данном случае именно к такой истории следует отнести и повествование о событии, известие о котором подхватили сто лет тому назад все газеты мира. Как правило, оно помещалось на первых страницах и набиралось крупным шрифтом: "Необычное небесное явление на пространстве западной полосы России". Обсуждалось оно в светских салонах и в научных кругах. На месте происшествия впоследствии побывали многочисленные отечественные и зарубежные научные экспедиции. Но к сожалению и сегодня, по прошествии многих лет, это явление остается для нас загадочным. Так что же тогда произошло?

25 ноября 1894 года в 19 часов 35 минут жители значительной территории Гродненской губернии были поражены необычным небесным явлением: при тихой туманно-пасмурной погоде, после того, как выпал небольшой снежок, по небесному своду мгновенно разлился, подобно молнии, яркий синевато-белый свет, похожий на свет бенгальского огня. Свет появился на юго-западе и двигался в северо-восточном направлении, где и исчез, продержавшись около полминуты. Вслед за светом в том же месте послышались раскаты грома, но гром этот был необыкновенным: гремело непрерывно четыре-пять минут, и звук грома шел в том же направлении, как и свет (затих на северо-востоке), причем, сам звук грома был глуховат и походил на барабанную дробь или, вернее, на звук катящегося экипажа по мостовой из крупного булыжника; каждый перекат грома слышался отчетливо, как отдельный удар, мгновенно следующий за прежним. Спустя некоторое время, на западе снова трижды сверкнула молния таким же светом, но без грома, а минут двадцать семь погодя на северо-западе появился световой столб, который имел конусообразную форму и был обращен острым концом вниз.

Через некоторое время из местечка Деречин Слонимского уезда Гродненской губернии об этом явлении сообщали более определенно: вечером 25 ноября вдруг стало так светло, как днем, и через минуту после того послышался такой удар, что казалось, земля сошла со своей оси. Гром продолжался около минуты. Все полагали, что прошла гроза, но через два дня дело объяснилось. Оказалось, что у местечка Рожаны, в 23 верстах от Слонима и в 43 верстах от Деречина упал аэролит громадных размеров, при этом земля долго дрожала, как при землетрясении. В Слониме дребезжали стекла и разные вещи падали на пол. По сообщениям видевших аэролит, он громадных и небывалых размеров. Интересно, что думает на сей счет современная наука о земле, знают ли об этом факте вездесущие и всезнающие краеведы, рассказывают ли о нем на уроках учителя?

*В.Черепица.*

*Спартакиада: Второй этап*

### Лидировали физики

Вторым видом круглогодичной спартакиады явились соревнования по мини-футболу среди факультетов университета. В первенстве участвовало десять команд. По три команды представили два факультета: физико-технический и права и экономики. Соревнования проводились по круговой системе в двух подгруппах на центральном стадионе г. Гродно. В финал пробились три команды физико-технического факультета (зам. декана по физкультурно-массовой и спортивной работе Смоляков О.И.), юридический и отделение МЭО. Они в упорной борьбе, показав технический, азартный и грамотный футбол, определили победителя. Чемпионом университета по мини-футболу стала дружная первая команда физико-технического факультета, 4 победы, одна ничья, 4:1 с командой МЭО, 1:0 с юрфаком, 2:2 с матфаком. 2-ое место заняла сильная вторая команда физико-технического (инженерное отделение), третье - отделение международных отношений. Поистине виртуозами футбола стали: Яцевич Виталий, Суходола Вячеслав, Брушко Сергей, Китурко Игорь, Калач Алексей, Павловский Андрей, Солдатенко Сергей, Миколута Александр, Батько Владимир, Матюк Дмитрий, Хотян Игорь, Ярошенко Евгений, Войтко Дмитрий, Сехин Александр, Почебут Юра, Ганин Александр. Им вручены грамоты и сладкие призы. Соревнования явились хорошей подготовкой для участия в городских и областных соревнованиях.

*А.Ожогин,*
*гл. судья соревнований.*

*Пятро Маляўка*

### ВІНШАВАЛЬНАЕ

*Здароўя, радасці, усмешак,*
*Падёлку поўны мех пацешак*
*Хай Дзед Мароз вам прынясе,*
*Каб станавіцца нам мудрэй,*
*Душой і сэрцам багацей*
*І між сабой дабрэй,*
*святлей.*
*Жадаем хлеба і да хлеба,*
*Крынічнае жывой вады,*
*Шмат сонца і блакіту неба,*
*Ні грама гора і бяды!*
*Каб вы знаходзілі ўцеху*
*Ў сваіх бацьках, унуках,*
*дзецях!*
*Ўжо на парозе год Мышаняці*
*Хай будзе шчасце ў вашай*
*Хаце!*





# Прымай, СТЭМ, прызнанне ў каханні!

## ДЕЛА НЕ ТАК ДАВНО МИНУВШИХ ДНЕЙ

Так уж повелось, что 17 ноября все прогрессивное студенчество широко отмечает День студента. Непрогрессивному обычно все равно. В Гродненском университете традиционно торжественно в этот день был открыт очередной стэмовский сезон. Студенческий театр "Вернисаж", несмотря на упорные слухи о его ветхости и замшелости, тряхнул всем, что было, и выдал неслабое праздничное шоу. В некоторых местах представления организаторы опасались за целостность стен, ходивших ходуном от здоровой реакции публики.

Кстати о публике. Лиц в национальных одеждах новых белорусов, а именно в малиновых или зеленых пиджаках, было очень немного. В основном преобладали матерые старшекурсники с редкими вкраплениями демократически настроенных преподавателей, хотя шоу предназначалось для первого курса. Но пока до первокурсников дошло, что такое СТЭМ "Вернисаж", билеты на него были распроданы. Положение не спасли и приставные стулья. Не попавшие в актовый зал главного корпуса вяло завидовали попавшим и тосковали в ожидании дискотеки. На сцене же демонстрировались самые изощренные способы "достачи" преподавателей на лекциях и зачитывались самые изысканные рецепты студенческой кухни. Наиболее удачным, по мнению экспертов-старшекурсников, был рецепт мяса по-английски: "Если вы живете в общежитии и хотите попробовать мясо по-английски, то смело идите на кухню, берите любое мясо и уходите, не прощаясь". Для большинства сидевших в зале начало стэмовского представления стало повторением виденного, но слегка забытого. Зато вторая часть шоу, а именно мюзикл "По мотивам бременских музыкантов" в исполнении молодого состава "Вернисажа" вызвала у публики бурное веселье, местами переходившее в безудержный восхищенный смех и топанье ногами. Таким образом, цель представления была достигнута: духовная жажда студентами зрелищ удовлетворена. Оставалось удовлетворить жажду танцев. Диск-жокеи были во всеоружии. Но... Но в любом стаде всегда найдется паршивая овца, которая испортит людям праздник. Так и здесь нашлось несколько великовозрастных олигофренов, решивших, что плотная толпа танцующих студентов - это лучшее место для взрывания петард. Из-за великой скученности танцоров милиционеры, бдевшие над соблюдением порядка, отловить их не смогли. И потому, когда не подействовало третье предупреждение, и взрывы продолжались, организаторы из соображений безопасности дискотеку прекратили, чем вызвали у всех глубокое уныние. Непримиримая оппозиция отправилась дотанцовывать в другие дискотеки города, а более скромные студенты грустно побрели по домам и общежитиям.

Очередной День студента стал достоянием истории...

***В.Лявшук.***

## ПАДЗЯКА ГЛЕДАЧОЎ

Ужо даўно існуе ва універсітэце студэнцкі тэатр эстрадных мініяцюр "Вернисаж" і, зазначу, з кожным годам папулярнасць яго нястрымна расце.

Хто любіць СТЭМ? З упэўненасцю адкажу, што ўсе: тыя, хто хоць адзін раз бачылі яго выступленне, абавязкова чакаюць чарговага відовішча.

На ўсіх канцэртах СТЭМа - аншлаг: прыходзяць і выкладчыкі, і супрацоўнікі, і студэнты, і тэлебачанне, прыходзяць сем'ямі, з дзецьмі, з маленькімі дзецьмі, якія зачаравана глядзяць на сцэну і лыпаюць вачанятамі.

У чым поспех тэатра? Класна іграюць рабяты, хаця яны і не прафесійныя акцёры, цудоўныя пастаноўкі ў добрым музычным суправаджэнні.

На свяце, прысвечаным Дню студэнта, СТЭМ выступаў у новым складзе, у асноўным, з ліку першакурснікаў. Трэба аддаць ім належнае: першая спроба ўдалася, аб гэтым сведчылі апладысменты гледачоў і пад час, і пасля выступлення.

Напярэдадні Новага года хочацца пажадаць любімаму "Вернисажу" творчых поспехаў і любові гледачоў. А мы, паклоннікі, дзякуем СТЭМ за ўсмешкі і жарты, якія даруюць нам артысты, за добры настрой. Віншуем студэнцкі тэатр эстрадных мініяцюр з Новым годам і гаворым, што мы з нецярплівасцю чакаем новых пастановак.

***Н.Дудко.***




### АБ'ЯВА

*Вы шукаеце абноўку для сябе ці сваіх дзяцей, бацькоў? Прыміце параду! Таварыства з абмежаванай адказнасцю "Друзья" шые дабротную дэмісезонную вопратку з тканіны "плашчоўка" для дарослых і дзяцей у шырокім асартыменце і прадае яе ў сваім салоне-магазіне па памяркоўных цэнах, без гандлёвых накрутак. Тут вы можаце заказаць неабходную вам рэч з вашай тканіны і па вашым малюнку.*

*Паспяшайцеся ў салон-магазін "Друзья" па адрасу: праспект Касманаўтаў,д.4а, тэл. для даведак 47-88-78.*


Сергей Псевдонимбов

## ПРЕДНОВОГОДНЕЕ

Раз в крещенский вечерок
Мужики гадали:
Правый сняв с ноги сапог,
Из окна кидали.
- Где ты, милая моя, -
Громко голосили.
И на улицу, поя
Песни, выходили.
Вокруг дома голышом
Бегали с подковой...
Милых не было, пришел
Только участковый.

***

Дед Мороз из лесу вышел
Посмотреть, чего и как.
Видит - на опушке мыши
Хрумают гнилой башмак.
А поодаль чуть - олени,
Изловчившись, кто как смог
И припавши на колени,
Из-под снега тащат мох.
Белки дерево изгрызли,
Как заправские бобры,
Бурые медведи-гризли
Разной нажрались муры.
Волки зайца догоняют,
Пасти жадные раскрыв,
Заяц весело петляет,
От волков уйдя в отрыв.
Серый волк - животный хищный,
Он кору не может есть.
Эх, ему мясной бы пищи -
Отощал бедняга весь.
И худая, словно палка,
Еле ноги волоча,
Вышла рыжая нахалка,
"Дайте что поесть!" - крича.
Дед Мороз перекрестился -
"Дурень старый, ё-моё,
До чего ж я докатился,
До чего довел зверье".
И ушел, кряхтя с досады,
Повторяя: "Ну и ну,
Это ж надо, это ж надо,
Позову пойду весну!"

*Па старонках народнага календара*

# Студзень, святамі багаты...

6 студзеня - Каляды. Гістарычнымі каранямі Каляды ўзыходзяць да старажытнасці, калі розныя народы святкавалі зімовае сонцастаянне. Калі на нашы землі прыйшло хрысціянства, пачатак Каляд сталі звязваць з Ражством Хрыстовым. Напярэдадні Ражства сям'я збіралася на перадкалядную вячэру - яна называлася ў народзе "куццёю", як і абавязковая рытуальная страва - каша з ячных ці іншых якіх круп. Гэта вячэра насіла і больш дакладную назву -першая, вялікая або багатая куцця. У калядную ноч дзяўчаты варажылі, па зорках вызначалі будучы ўраджай.

7 студзеня - Ражство Хрыстова. Пасля шматтыднёвага посту, нарэшце, прадстаўлялася магчымасць паесці скаромнага. Па вуліцы хадзілі калядоўшчыкі, ладзілі "калядкі".

13 студзеня - другая куцця напярэдадні старога Новага года. Гэта вячэра адзначалася ў раскошы і насіла назву "шчодрай".

14 студзеня - стары Новы год, Васілле. У народзе казалі, што першы дзень года, праведзены належным чынам, нібыта гарантаваў удачу на ўвесь год.

19 студзеня- Вадохрышча-апошняе свята каляднага цыклу. Народ верыў у цудадзейную сілу вады ў гэты дзень, калі згодна з праваслаўным календаром святкавалася хрышчэнне Ісуса. "Святой" вадой апырсквалі новую хату, яе давалі выпіць хвораму.

Сёння ўсе гэтыя святы нібыта зноў варочаюцца да нас. Шматвяковыя традыцыі не згубіліся...

## КАЛЯДНЫЯ ЎСМЕШКІ



*Лепшы падарунак для жонкі пад Новы год - брыльянтавыя завушніцы і пярсцёнак.*

І на гэты раз не паступіўся прынцыпамі: сустрэў Новы год, як звычайна, - пад сталом.

*Год пацука (мышы) трэба сустракаць, абавязкова ўладкаваўшы за навагоднім сталом сімпатычнага пацучка (мышку). Калі ў вас яго выпадкова няма, запрасіце ў госці некага са сваіх знаёмых...*

Заначаваўшы ў каханкі, не забудзьцеся раніцай вярнуцца да жонкі.

*Каб не хварэць пасля святаў, за навагоднім сталом не трэба нічога мяшаць: спачатку піце толькі шампанскае, потым - толькі гарэлку, затым толькі віно, а пасля - толькі адно піва. І ні кропелькі - ідучы на працу!*

# Паспрабуйце, калі ласка!

### МАКОЎНІК СВЯТОЧНЫ

Святочны рулет з макам адрозніваецца ад звычайнага не толькі тым, што ў ім менш цеста і больш макавай начынкі, але і самой начынкай, якая гатуецца з сапраўднай святочнай шчодрасцю.

Два віды цеста: дражджавое і пясочнае. Менш часу займае пясочна-дражджавое.

400 г пшанічнай мукі, 150 г сметанковага масла, 50 г дражджэй, старанна перамешаных з чайнай лыжкай ванільнага цукру або з цэдрай 1/2 лімона, 2 ст. лыжкі цукровай пудры, 2 яйкі, 1-2 жаўткі і 1/3 чайнай лыжкі солі пасекчы нажом на дошцы, каб усе кампаненты добра перамяшаць.

Затым замясіць рукамі цеста, каб яно атрымалася не вельмі тугое і бліскучае. На пасыпанай мукой дошцы тонка раскатаць гатовае цеста, надаць яму форму прамавугольніка, нанесці макавую начынку, пакінуўшы па баках свабодныя палоскі цеста шырынёй 2 см, скруціць асцярожна, перакласці ў прадаўгаватую форму, якую перад гэтым памазаць маслам ці накрыць змазанай тлушчам фальгой і даць рулету падняцца. Праз гадзіну паставіць рулет у падагрэтую духоўку. Праз 45-50 мінут ён павінен быць гатовы.

### ЦЕСТА ДРАЖДЖАВОЕ

Яно гатуецца з 400 г пшанічнай мукі, 150 г цукровай пудры, 150 г масла, 2 яек, 1/2 шклянкі малака, 40 г дражджэй і крышачку солі.

Масла старанна расцерці з цукрам, паступова дадаючы яйкі, соль і разведзеныя ў малаку дрожджы. У самым канцы ўсыпаць муку і замясіць цеста. Пакрыць сурвэткай і даць падняцца на працягу гадзіны. Потым цеста раскатаць на дошцы, змазаць бялкамі, каб начынка не адставала ад цеста і аднолькава размеркаваць начынку. Цеста даволі шчыльна скруціць, канцы добра зашчыпаць. Выпякаць 45-50 мінут.

### НАЧЫНКА З МАКУ

40 г памытага маку заліць 1 л гарачага малака і варыць на слабым агні 30 мінут. Мак працадзіць і прапусціць праз мясарубку 3-4 разы. У посудзе з тоўстым дном растапіць 150 г масла, 3/4 шклянкі мёду, 1 чайную лыжку ванільнага цукру, дабавіць 100 г не вельмі дробна нарэзанага міндалю (ці іншых арэхаў), 150 г рызынак, 1/2 шклянкі дробна нарэзанай і зваранай у цукры апельсінавай цэдры. Пасля пакласці мак і падсмажыць усё разам на працягу 15 мін. Памешваць, каб маса не падгарэла. Калі маса астыне, дабавіць 3-4 жаўткі, старанна пацёртых з цукрам, і моцную пену, узбітую з астатніх бялкоў. Смак макавай масы будзе больш тонкім, калі ўліць чарку каньяку ці рому.

Гэта цудоўная начынка вельмі дарагая па сённяшніх часах, патрабуе шмат часу, але Каляды бываюць толькі раз у год.

Прыемнага апетыту вам і цудоўных Каляд!





# Огненная крыса стучится в дверь

В Новый год мы вступаем вместе с огненной крысой. А раз такое дело, то суеверным педантам советуем на праздник одеться... нет, не в серенькое, а в оттенки пожара. Если нет ничего такого из одежды, можете повязать пионерский галстук; а если последнего тоже не найдете, то воткните себе куда-нибудь (например, за ухо) красную гвоздику. "Красивый" (по древнерусским понятиям) цвет просто обязан принести вам много всего самого... в следующем году.

Кстати, по-настоящему крыса вступит в свои права только 1 февраля. Фаны новогодних праздников могут повеселиться еще раз в феврале. А потом и в марте. Ведь 21-го - авестийский Новый год (год орла).

Но вернемся к нашей крысе и к людям, которые их напоминают...

*ОГНЕННАЯ КРЫСА*

Крыса рождена под знаком шарма и агрессивности. С первого взгляда она кажется спокойной, уравновешенной и веселой. Но не верьте этому. Это - кажущаяся видимость, она скрывает вечное возбуждение и систематическую агрессивность. Достаточно пообщаться с ней подольше, чтобы открыть ее нервозность, беспокойство, темперамент холерика.

Это - создатель неразберихи и иногда даже маньяк. Во всяком случае - скандалист. Крыса любит собрания друзей и охотно сплетничает. Она не гнушается злословием и поэтому больше у нее знакомых, чем настоящих друзей. Это возможно еще потому, что она никогда и никому не доверяет. Она сдержанна и хранит свои заботы для себя.

Будучи мелочной и мещанкой, крыса остается честной. У нее способность идти до конца в делах, которые она предпринимает, даже если это дело обречено на провал. Ей удается устроить свою жизнь и преуспеть в ней, если она будет подавлять свое недовольство и чрезмерный вкус к данному моменту.

У крысы будет счастливое детство и беззаботная юность. Вторая часть ее жизни будет бурной. Она сможет потерять все свое состояние в неудачном деле или свое счастье из-за сентиментальных осложнений. Третья часть ее жизни будет устроенной и старость спокойной, насколько этого можно пожелать. Но все может быть иначе, в зависимости от того, родилась крыса летом или зимой. Если летом она вынуждена будет заниматься поисками пищи, пусть обращает внимание на ловушки, расставленные на ее пути. Это может закончиться тюрьмой или смертью от несчастного случая.

*ГОД КРЫСЫ (1984, 1996)*

Экономьте про запас. Этот год благоприятен для заготовки консервов, варенья, покупки в кредит, займов, вложений. Он окажется хорошим в финансовом отношении, но скрывает возможность нищеты последующих лет.

В политическом отношении - неожиданность. Обвинение, осуждение. Год, благоприятный для литературы. Если Ваш ребенок родится в год крысы летом, он будет счастливым.

*КРЫСА* - может воспользоваться этим годом, чтобы отложить деньги. Этот год будет ей со всех точек зрения благоприятным.

*ТИГР* - может думать о будущем. Этот год ему покажется скучным и не принесет ничего.

*КОТ* - пусть он будет осторожным в делах и не доверяет своим друзьям. Этот год может оказаться для него годом предательства.

*ДРАКОН* - этот год благоприятен для него. Он сможет им воспользоваться, чтобы сделать вложения. Пожелаем ему любви крысы.

*ЗМЕЯ* - немного бурный для змеи. Этот год не будет для нее слишком неблагоприятным, так как она благоразумна.

*ЛОШАДЬ* - плохой год для нее. Крыса сделает все, чтобы навредить ей. Нужно быть осторожной в делах и любви.

*КОЗА* - пусть остается в деревне и рассчитывает на сбережения других, так как сама не сможет их сделать.

*ОБЕЗЬЯНА* - великолепный год для нее. Все ей удается. И если какая-либо крыса влюбится в нее, она будет самой счастливой из обезьян.

*ПЕТУХ* - осторожнее в отношении плохих дел. У него будет тенденция отложить все свои... яйца в одну корзину.

*СОБАКА* - накопления ее не интересуют, если не представляют высший интерес. Она будет скучать.

*СВИНЬЯ* - у нее будут блестящие дела. Она может встретить любовь, год хорошего прироста для нее.

*"МК"*

*Перадсвяточныя парады*

# На стале - свята



*Радасць, вяселле, надзею на здзяйсненне жаданняў даруе нам цудоўнае свята - Новы год. І стол у гэты вечар павінен адпавядаць нашаму настрою - прыбраны, святочны, з прыемнымі сюрпрызамі.*

*Калі вы чакаеце гасцей, на прыгожы абрус палажыце яркія сурвэткі, пастаўце кветкі, дзве - тры галінкі ёлкі. Упрыгожаць стол некалькі каляровых свечак у падсвечніках.*

*Запаліце іх ў поўнач, пагасіўшы святло ў пакоі. На стол пакладзіце прыгожа запакаваныя, перавязаныя каляровымі стужкамі маленькія падарункі.*

*Загадзя абдумайце, якія прыгатаваць стравы, чым парадаваць родных і сяброў. Вячэру лепш за ўсё пачаць не пазней 21 гадзіны. Няхай ваш навагодні стол упрыгожаць салаты, лёгкія закускі.*

*Новы год прынята сустракаць бакалам шампанскага, а яно добра спалучаецца з дэсертам, марожаным. Ці мала арыгінальных, смачных, прыгожых страў можна*



*прыгатаваць для навагодняга стала!*

*Такім чынам, пакаштуйце тое, што мы вам прапануем.*

### *ПРАВАНСАЛЬ*

*Нашаткуйце капусту і моркву, наскрыляйце часнок у адвольных прапорцыях. Шчыльна пакладзіце ў 3-літровы слоік і заліце наступным растворам: на 1 л гатаванай вады - 2-3 ст. лыжкі цукру, 1/3 шклянкі солі, 1/2 шклянкі алею, чвэрць шклянкі воцату. Спецыі: лаўровы ліст, мята, перац. Вытрымайце суткі пры пакаёвай тэмпературы, потым пастаўце на халад. Яшчэ праз дзень гэтую салату можна падаваць на стол.*

### *РЫБНАЯ САЛАТА З АГУРКАМІ*

*Нашаткуйце дробна салёныя агуркі і адвараныя яйкі, дадайце бляшанку рыбных кансерваў, шклянку адваранага рысу, старанна перамяшайце, перакладзіце ў талерку і заліце сумессю з алею, солі, перцу і гарчыцы.*

### *НАВАГОДНІ ТОРТ*

*Узбіце 250 г сметанковага масла з 200 г цукровай пудры, дадайце па адным 3 жаўткі з яек і 100 г растопленага шакаладу, дробна нарэжце 250 г мармеладу, накрышыце 500 г печыва і спырсніце ўсё каньяком (50 г) або вішнёўкай. Праз 15 мінут перамяшайце, перакладзіце на талерку, аформіце ў выглядзе круглага торта і пакіньце на ноч у халаднаватым месцы. Раніцай (31 снежня) пакрыйце торт зверху і збоку ўзбітымі бялкамі з цукрам, упрыгожце.*

### *ТОРТ-ЖЭЛЕ "ПТУШЫНАЕ МАЛАКО"*

*Узбіць 8 бялкоў і 2 шклянкі цукру, крыху лімоннай кіслаты. Дадаць падагрэты жэлацін (20 г на 1 шклянку вады), старанна перамяшаць і заліць у прыгожую форму, паставіць на халад. Калі застыне, дастаць з формы, упрыгожыць шакаладам, арэхамі або садавінай. Можна "пасадзіць" яго на любы падрыхтаваны і змазаны варэннем або крэмам корж.*

### *НАПОІ З КАЛЯРОВЫМ ІЛЬДОМ*

*Зробленыя дома ліманады, морсы або сокі можна падаваць з каляровым ільдом, атрыманым пры замарожванні сокаў, кавы або малака. Разбаўце сокі, дадайце цукар па густу. У шклянку пакладзіце 2-3 кавалачкі лёду рознага колеру.*




**Рэдактар С.МУРЫНА.**
**Камп'ютарная вёрстка Ю.РАДСА.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытатаў, эканамічных даных, асабістых імёнаў, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.

Газета выходзіць адзін раз у месяц.
Аб'ём - 1 друк. арк.

Здадзена ў набор 20.12.95 г.
Заказ ________
Наклад 700 асобнікаў.

Газета набрана, звярстана і аддрукавана на тэхніцы выдавецкага аддзела Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта.
Рэгістрацыйнае пасведчанне №421.



Наш адрас: 230023, г.Гродна, вул. Ажэшкі, 22, пакой 404.
44-72-97



Заснавальнікі: Вучоны Савет універсітэта, прафкам супрацоўнікаў, прафкам студэнтаў.